# Салодкая цыбуля

*Міхась Даніленка*

Бабуля Марфа сабралася ісці ў агарод садзіць цыбулю. Маленькая Алеся папрасілася:

— І я з табой.

— Добра, унучка. Пойдзем сёння цыбульку пасадзім.

На дварэ прыгравае сонейка. Вераб'і-жэўжыкі ў цёплым пяску купаюцца. Высока ў небе распластаў крылы і робіць плаўныя кругі злодзей-каршун: пэўна сочыць хіжым вокам, калі якое кураня зазяваецца, ад сястрычак і маці адстане.

За ліпамі ў агародзе паравалі грады. Бабуля рабіла ямку і акуратна саджала ў яе цыбуліну.

— А вось гэты радок — з краю — ты пасадзіш, — паказала яна Алесі.

Дзяўчынка ўторквала ў зямлю следам за бабуляй Марфай адну падрэзаную цыбуліну, другую, трэцюю. Як і бабуля, Алеська кожны раз паўтарала:

— Расці, цыбулька, — агародная матулька. Не бойся халадоў — будзь заўсёды маладой…

Міналі дні, і з зямлі праклюнуліся кволыя зялёныя расточкі.

А потым настаў дзень, калі пайшла Алеська ў агарод і нарвала з таго крайняга радка сакавітых пёрак. Ела Алеська цыбулю з духмяны хлебам і пыталася ў бабулі Марфы:

— А чаму гэта, бабулька, мая цыбуля такая салодкая і смачная?

— Гэта таму, унучка, што ты яе сваімі рукамі садзіла, — усміхалася бабуля.